**МІНІСТЭРСТВА ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

пр-т Пераможцаў, 11, 220004, г. Мінск
тэл./факс +375 17 203 92 31, +375 17 203 34 35
e-mail: info@mininform.gov.by

**МИНИСТЕРСТВО ИНФОРМАЦИИ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ**

пр-т Победителей, 11, 220004, г. Минск
тел./факс +375 17 203 92 31, +375 17 203 34 35
e-mail: info@mininform.gov.by

02.07.24 № 01-14/104-к01
На № _________ от _________

Аб разглядзе звароту

У Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь ваш зварот разгледжаны ў межах кампетэнцыі.

Паведамляем, што ў адпаведнасці з пунктам 1 артыкула 9 Закона Рэспублікі Беларусь ад 17 ліпеня 2008 г. № 427-З "Аб сродках масавай інфармацыі" масавая інфармацыя можа распаўсюджвацца ў Рэспубліцы Беларусь на дзяржаўных мовах Рэспублікі Беларусь і на іншых мовах.

У адпаведнасці з артыкулам 27 Закона Рэспублікі Беларусь ад 26 студзеня 1990 г. № 3094-XI "Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь" у Рэспубліцы Беларусь мовамі сродкаў масавай інфармацыі з'яўляюцца беларуская і (або) руская, а таксама мовы іншых народаў, прадстаўнікі якіх жывуць у рэспубліцы.

Такім чынам, рэдакцыі тэлепраграм маюць права самастойна вызначаць мову вяшчання (беларускую і (або) рускую). Пры гэтым, у выпадку стварэння сеткі вяшчання на дзвюх мовах, аб'ём кожнай з іх можа, у тым ліку, залежаць ад канцэпцыі вяшчання СМІ і пераваг аўдыторыі.

Неабходна адзначыць, што, нягледзячы на відавочную перавагу аб'ёму тэлеперадач на рускай мове, шэраг з іх аддаюць перавагу вяшчанню на беларускай. Так, напрыклад, "Беларусь 3" – тэлепраграма Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь асвятляе дзяржаўную інфармацыйную палітыку ў галіне культурнага жыцця нашай краіны. Зыходзячы з гэтага, значная частка кантэнту і інфармацыі ў эфіры гэтай тэлепраграмы прадстаўлена на беларускай мове.

Адказ на зварот можа быць абскарджаны ў парадку, прадугледжаным артыкулам 20 Закона Рэспублікі Беларусь ад 18 ліпеня 2011 г. № 300-З "Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб".

Першы намеснік Міністра А.М.Кунцэвіч